# ФОЛЬКЛОРИСТИКА И ЭТНОГРАФИЯ

*УДК 393(476.2-37)*

**В. М. Абрамовіч**
***Навук. кір. – В. С. Новак, д-р філал. навук, прафесар***

## ПАХАВАЛЬНЫЯ АБРАДЫ І ГАЛАШЭННІ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ФАЛЬКЛОРУ РЭЧЫЦКАГА РАЁНА)

*У артыкуле даследуецца пахавальная абраднасць Рэчыцкага раёна, якая ўяўляе сабой не проста рытуал развітання, але з'яўляецца складанай і глыбокай сістэмай, накіраванай на падтрыманне гармоніі паміж светам жывых і памерлых, дзе кожнае дзеянне, слова, прадмет маюць сімвалічнае значэнне і адлюстроўваюць спрадвечныя ўяўленні пра неўміручасць душы і цыклічнасць жыцця.*

Пахавальная абраднасць уяўляе сабой складаную сістэму рытуалаў, вераванняў і звычаяў, якія складаліся на працягу многіх стагоддзяў. З ёй звязаны пэўны комплекс уяўленняў аб жыцці і смерці, пра "той" свет, продкаў, які займае важнае месца ў рытуальна-міфалагічнай сферы жыцця беларусаў. Да выканання пахавальных абрадаў ставіліся вельмі сур'езна, сачылі, каб усё да дробязей было зроблена так, як было прадугледжана традыцыяй.

Лічылася, што людзі, якія памерлі "сваёй смерцю", пасля правядзення адпаведных рытуалаў пераходзілі ў статус продкаў. З таго свету яны сачылі з за жыццём сваёй сям'і і спрыялі здароўю і дабрабыту, калі сям'я выконвала ўсе абрады ўшанавання продкаў.

Добрай і правільнай лічылася смерць чалавека ў роднай хаце сярод дзяцей, унукаў. Адчуваючы набліжэнне смерці, чалавек развітваўся са сваякамі, дараваў ім крыўды і прасіў прабачэння за свае. *"Існавала шмат павер'яў і прыкмет, якія гаварылі, што хутка прыйдзе смерць: калі сабака капае яму каля варот, парога альбо акна; калі сабака вые; калі курыца запяе – будзе няшчасце; нельга хадзіць у адной абутай назе, а другая разутая - памруць бацькі; калі паб'еш люстэрка ці рассыпеш соль – будзе бяда; калі ў гэтым жыцці чалавеку жывецца дрэнна, на тым свеце ён будзе шчаслівы"* (г. Рэчыца) [1, с. 248]. "*Калі да чалавека блізілася смерць, то адчынялі ўсе замкі, вокны, дзверы, каб душа выляцела і ёй нічога не перашкаджала. Заўсёды зачынялі люстэркі хусткамі. Ханілі заўсёды ў тым адзенні, якое насілі ў гэтай мясцовасці. У труну клалі любімыя рэчы нябожчыка*" ( в. Бронае) [2].

Па магчымасці запрашалі святара для прычасці і споведзі.

Паміраючаму ўкладвалі ў рукі і запальвалі свечку, шчыльна закрывалі яму вочы і рот, спынялі гадзіннік у хаце, люстэрка завешвалі ручніком. *Калі чалавек паміраў, абавязкова завешвалі люстэркі, каб праз іх душа зноў не вярнулася і не забрала каго-небудзь з родных з сабою* (в. Бронае) [1, с. 244].

Падчас агоніі неабходна было захоўваць поўную цішыню, і толькі пасля таго, як душа адышла, жанчыны пачыналі галасіць. *Па нябожчыку нельга вельмі плакаць, бо яму будзе дрэнна на тым свеце* (г. Рэчыца) [1, с. 248].

*Галашэнні адбываліся толькі ў хаце. Калі нябожчыка выносілі з хаты, не галасілі. Забаранялася галасіць (прыказваць) на трэці, дзевяты і саракавы дзень пасля пахавання.*

*А, Мішка, мой галубок,*
*На каго ж ты мяне аставіў?*
*А з кім мне цяпер жыць?*
*А адкуль мяне цябе ждаць?*
*А дзе мне цябе шукаць?*
*А з якога ты боку прыдзеш?*
*А з якой стараны прыляціш?*
*Ці ты салавейкам, ці ты вірабейкам?*
*А, Мішка, мой дарагі,*
*А як мне без цябе трудна жыць,*
*А на што ж ты мяне кінуў?*
*А на што ж ты мяне аставіў?*
*А адкуль я ні еду, да адкуль ні прыду,*
*Дык умяне ўхаці хто-та жджэ,*
*А цяпер хто будзе ждаць?*
*А цяпер хто будзе стракаць?*
*Ды няма нідзе нікога.*

***

*Мая дарагенька да залаценька,*
*Да ўстань, мамка, паглядзі.*
*А я плакала, плакала па братку,*
*А братка родненькі,*
*На каго ж ты дзетак пакінуў?*
*Засталіся сіраты, да маленькія,*
*Да ні мамкі, ні папкі,*
*Да хто ж іх будзе даглядаць?*

***

*Ах, мая ж ты мамка,*

*А мая ж ты, зязюлечка!*
*Чаму ж ты памерла,*
*Сваю дочку асіраціла?*
*Ах, некаму ж мяне пажалеці.*
*Я й ухаце, я й уклеці*
*Слёзкамі плачу,*
*А шчасця-долі да й не бачу (Камелія).*

*Абед вараць, ды людзі збіраюцца. Папоў звалі, яны і галасілі. Калі бацька мой памёр ды кума прышла. Яго палажылі, дык яна малілася ўсё. І зеркала закрываюць якой скацеркай ці рушніком. (Новак)***.** *Як умрэ хто, вызывалі папа, да яшчэ бабак звалі. Песні пелі бажественныя, Богу маліліся. Закрывалі зеркала, штоб нячыстая сіла не глядзела, не перакрыўлевала, не перабягала дарогу. Рушніком звычайна закрывалі* (г. Рэчыца) [1, с. 242].

Наступным абрадавым дзеяннем было абмыванне нябожчыка.

Для гэтага запрашаліся старыя людзі такога ж полу, як і памерлы. "*Ваду, якой мылі пакойніка, бяруць і выліваюць у вароты, што б ён хадзіў яшчэ да сарака дней* (в. Левашы) [2]*."* *"Абязацельна, што б свае дзеці не мылі пакойніка, не выносілі магілу і не закапвалі.*

*Сорак дней нада было ваду, якую ставяць на стол для пакойніка, выліваць у тое месца, дзе ніхто не ходзіць. У нас вылівалі ў вугал пад ікону.*

*Абязацельна на стол ставілі канон, які ўсе даўжны былі па тры разы ложкай з'есці.*

*Ікону абязацельна доўжан быў несці старэйшы мужчына.*

*Калі ў труну лажылі пакойніка, то на тым месцы, дзе ён ляжаў, нада было пасядзець усім родным, каб ён ім не сніўся плоха.*

*Пасля кладбішча абязацельна нада рукі мыць"* ( в. Каравацічы) [2].

Нябожчыка апраналі ў загадзя падрыхтаванае новае, а калі не новае, то добра памытае адзенне. У Заходнім Палессі для гэтага выкарыстоўвалі самаробнае палатнянае адзенне белага колеру.

"*Родным адзяваць нябожчыка не нада. Родныя паглядаюць толькі. Выносілі гроб з хаты хлопцы, друзья, родныя не бяруць.*

*Потым былі памінкі, 3 дня, 9 дней, 40 дней. Сабіраліся за сталом і паміналі*

*Усе закрывалі зеркала, елі толькі ложкамі, вілкамі нельзя* (г. Красная Дуброва) [1, с. 243].

*"Мылі нябожчыка, каго пазавуць. Хто е з мужчын, той і выносіць труну. Ну, каторым насовічкі перавязуюць. А вот як мы харонім, дак апускаем на палаценцах, а тады етыя палаценцы разразаем і аддаем стым, што ўжэ хто апускаець. На трэці дзень хадзілі ў цэркву – адправілі.*

*У дзевяць дней, ето дзевяціны, паехалі ў цэркву, адправілі дзевяць дней, абед аддалі. І ў сорак дней, ста за здароўныя падымаецца ў цэркві. За здароўныя паднімаем, таксама абед аддаем і ў год. А тады калі жэланне е, вот шчэ на цэркву падаеш: вот на год падасі, напрыклад, ето в Рэчыцы каждую суботу правяць у цэркві, ето ж пагрэбенне адпраўляюць, там кажды дзень адпраўляюць, ну, вот асобінно ў суботу памінаюць, еслі да году аддаеш. Да сарака дней душа нябожчыка находзіцца так, як і па пастройцы, а тады ўжо яна ідзе* (в. Перасвятое) [1, с. 244–245].

*"Маладой дзяўчыне адзявалі вянок,плацце белае, туфлі. Я знаю,што на том свеце не ходзяць, звёзды на небе гэта душы. Калі зорачка падае, гэта Бог душу каму-небудзь адаў. Галасілі на пахаранах, як неўгамонныя. Кажуць ён чуе, пакуль яго не закапалі, але я ведаю што не чуе. У народзе кажуць, блізкім нельга гроб несці, а ў Евангеллі напісана: калі любішь матку і на руках нясіце. Перад гробам нясуць ікону, у нас абычна нясуць мужчыны. У нас правяць як хто .Я сваіх бацькоў адпраўляла трэціны, сорак дзён і паўгода, а па сястры і год яшчэ. Мая сястра была нядобрая, я хадзіла да бацюшкі. Ён сказаў, што трэба ваткнуць ёй у ручнік свечку і кажа будзе яна ўставаць перед страшным судом"* (в. Заспа) [2].

Нябожчык павінен быў пераначаваць у сваей хаце хоць бы адну ноч, пры гэтым яго не пакідалі аднаго ў хаце. Родныя, сваякі і суседзі ўвесь час знаходзіліся побач, не спалі, маліліся, ціха плакалі. "*Нябожчыка не мые ні дачка, ні сын, а то так і саседзі мыюць. Калі засталася хросная, то яна амаль усё дзелала. Цвяты жывыя на магілкі не кідалі, таму што гэта смерць. Нельга грашыць, а то на тым свеце будзе цяжка.*

*Пасля нябожчыка хату нельга вымятаць, трэба пераначаваць без яго, а пасля мясці. А нельга, таму што яго сляды замятаеш. Тым людзям, што сядзелі ноч з нябожчыкам, давалі хусткі і насавыя платкі.*

*Хто нясе труну, таму перавязвалі тую руку, якой нясеш"* (в. Гарошкаў) [1, с. 244].

*"Родственнікі не моют пакойніка, только соседзі. Сядзелі ля яго ноч, пакойнік одзін в хаце не должен оставацца. Выносілі гроб чужіе людзі. Своім ямкі капаць нельзя, особенно мужчіну до сарака лет і не женатому, то будзет плохо. Прі выносе пакойніка із дома нужно гроб немного пріспусціць. За стол прі похоронах первымі садзяцца мужчіны, а потом остальные. Із еды былі: канон, борщ, аладкі "* (в. Азершчына) [2].

Сваякі і суседзі заўсёды падтрымлівалі сям'ю нябожчыка ў цяжкую гадзіну. Рабілі труну і капалі магілу толькі чужыя людзі, прычым рабілася гэта бясплатна, за пачастунак. *"Труну ніколі не рабілі родзічы, а рабілі маладыя хлопцы, і іх затым заўсёды адорвалі падарункамі"* (г. Рэчыца) [1, с. 248]. У труну для нябожчыка клалі ўсё неабходнае, што можа спатрэбіцца яму на тым свеце: грошы для аплаты месца на могілках ці для пераправы праз раку на той свет, прадметы адзення, шапку для мужчыны і

намітку для жанчыны, нож, рамеснікам – прылады іх працы, дзецям – цацкі, свечку, абразок і г. д.

Труну з хаты выносілі абавязкова чужыя людзі. Пры гэтым тры разы стукалі труной аб парог хаты, каб памерлы не вяртаўся туды. “*Нябожчыка заўсёды выносілі нагамі наперад, а то ён выглядзеў бы сабе яшчэ каго-небудзь”* (г. Рэчыца) [1, с. 248].

*“Калі паміраў чалавек, на вуліцы ставілі бочку і стукалі ў яе, тыды шсе разумелі, што хтосьці помер.*

*Рукі мертваму звязваюць*

*Мёртвага везлі на машыне.*

*Калі паміраў малады, яго неслі на руках. У зямлю апускалі не на вяроўках, а на ручніках.*

*На стале абязацельна далжна быць булачка свяцоная, яшчэ ладкі, каша і боршч”* (в. Левашы) [2].

*“Тых, хто нёс гроб, абвязвалі палаценцам, рукі ім абвязвалі. Яшчэ на пахароны нічога не павінна было ляжаць на голым стале. Калі кніжка ляжала, то яна павінна ляжаць на скацерці ці на палаценцы. Як бы лічылася, што пакойнік чытае яе. А калі забіралі, то вмесце са скацерцю ці палаценцам”* (г. Холмеч) [1, с. 244].

*“У нас, у дзярэўні, було так. Запрагалі каня, на калёса ставілі бочку. Еслі хто памёр, то ў бочку стукалі.*

*Калі ж паміраў малады, то яго неслі на рушніках, потым на іх апускалі. Рушнікі тады гэтыя рэзалі і аддавалі таму, хто нёс нябожчыка. Завязвалі платочкі тым, хто вяночкі нёс”* (в. Левашы) [2].

Калі ўсе ішлі на могілкі, нехта са сваякоў павінны быў застацца ў хаце. Пасля вынасу труны мылі лавы і падлогу, усё, асабліва тое месца, дзе ляжяў нябожчык, пасыпалі збожжам і хмелем, каб тут працягвалася жыццё і больш ніхто не паміраў.

***“Скоро, скоро день прискорбный***

*Скоро, скоро день прискорбный*
*И час смертный подойдёт,*
*Скоро ангел мой Господний*
*Чашу горку поднесёт.*
*Разделить он душу с телом,*
*А душе он дасть приказ:*
*Ты иди скорее к Богу,*
*Он потребовал сейчас.*
*Ой, как страшно и ужасно*
*На ответ к Богу идти,*
*А еще хужей и страшнее*
*Все грехи свои нести.*
*Я явлюсь Христу-Спасителю,*
*За престолом он сидит.*

*За грехи мои тяжёлы*
*На меня он не глядит.*
*Сладко пир пировал я,*
*Не щадил сирот и вдов*
*Бедных, нищих не дариля,*
*Не познал я Божьих слов.*
*Отца-матери не чтил я,*
*Всё старался раздражать,*
*А теперь стыдно пред Богом*
*Мне за всё ответ держать.*
*Дни постные не постил я,*
*Говорил, что есть не грех,*
*Закон Божий не признал я,*
*Принимал всё за смех.*
*А по правую сторонку*
*Стоить ангел, Божий свет.*
*Посмотрелемуя в руки,*
*Добрых дел моих там нет.*
*А по левую сторонку стоить ангел,*
*Искуситель мой стоить,*
*Все дела мои тяжёлы*
*Уруках своих держать.*
*И от юности моей*
*Всё записано уего.*
*Прочитал он - зарыдал я,*
*Всё записано уего.*
*А потом Господь сказал мне:*
*На Земле есть мой закон,*
*Кто его не почитает,*
*Тот пойдёт в вечный Огонь.*
*Горко плачу и рыдаю,*
*Да вот позно мне рыдать,*
*Что ленился молиться Богу,*
*Любил только пировать”* (в. Азершчына) [1, с. 246–247].

Наперадзе жалобнай працэсіі неслі крыж. Тым, хто праводзіў нябожчыка, забаранялася азірацца назад, бо верылі, што інакш у вёсцы хутка зноў хто-небудзь памрэ. Калі працэсія ішла праз вёску, усе павінны былі спыніць працу. Абганяць шэсце таксама было нельга, каб не наклікаць няшчасця.“*Калі будзеш глядзець праз акно, калі вязуць нябожчыка – памрэ хто-небудзь”* (г. Рэчыца) [1, с. 248].

Працэсія спынялася каля прыдарожнага крыжа на скрыжаванні. Тут развітваліся з памерлым і закрывалі труну. Труну апускалі ў магілу на ручніках, намітках ці вяроўках, якія потым пакідалі на могілках, вешаючы на дрэвы. Блізкія сваякі кідалі на труну зямлю і грошы. На Палессі, каб прадухіліць далейшыя смерці ў сям'і, кідалі зачынены замок. Сваякоў хавалі побач, каб яны заставаліся разам і на тым свеце. Праваслаўных хавалі галавой на захад, католікаў – на ўсход.

Нежанатых хлопцаў і незамужніх дзяўчат хавалі ў вясельных строях. На іх пахаванне выпякалі каравай, а пасаг дзяўчыны раздавалі яе сяброўкам. На пахаванне збіралася шмат моладзі, якая па дарозе на могілкі кідала кветкі. Маленькіх дзяцей хавалі ў кашулях без галаўных убораў.

Самазабойцаў не абмывалі і не пераапраналі, хаваючы ў адзенні, у якім яны памерлі. Памінкі па іх не спраўляліся; бліжэйшым сваякам забаранялася прысутнічаць на пахаванні і галасіць. Самазабойцаў хавалі за межамі могілак – у лесе ці на балоце, а тапельцаў – на берагах рэк і азёраў.

Пасля пахавання з могілак ішлі хутка і іншаю дарогаю, абавязкова мылі рукі. Усе ўдзельнікі абраду збіраліся ў хаце нябожчыка на бяседны стол. *"Кагда ўжэ на памінках, тожэ сначала моляцца Богу, садзяцца абедаць. Усегда – і на гарачым стале – канон должан быць, это мёд, сахар і булка. Галосяць на памінках.*

*Памінаюць і ў 9 дней, і ў 40, і ў паўгода, і ў год.*

*Гарачы стол – это кагда ўмірае чалавек, у тот жа дзень. Дажэ й траціны правяць – это ў тры дня. Чалавек должан тры дня ляжаць у доме.*

*А кагда памінкі, дзелаюць благадарэнне Богу, жэншчыны садзяцца і пяюць памінальныя песні, жалобныя.*

*Пакойніка-мужыка мыюць мужчыны, жанчыну – жанчыны. Не блізкія. Блізкім нельзя нічога дзелаць на пахаранах. Жэншчынам, каторые начуюць, дараць платкі, даюць усім ім на памяць.*

*А кагда ўмірае маладая дзеўка, адзяваюць ёй вянчальнае плацце, фату, таму што яна ўжо не будзе замуж выходзіць, вянчацца. Гэта робяць, шоб там яна знайшла сабе пару, такое павер'е.*

*Людзей, каторые вешалісь, каторые дзелалі сабе ўбійства, харанілі аддзельна, возле кладбішча, у староначке, шоб яны не былі на кладбішчы, счыталі іх дзьявалямі, Іх башюшка нс адпяваў, чыталка не чытала, ніхто ля іх не быў"* (в. Жмураўка) [1, с. 245–246].

*"Беременным нельзя садзіцца за похавальны стол. А еслі беременная оказалась на похоронах, то ей надо выйці в огород, прісесць на корточкі, пріжавші жівот к ногам, што бы это не повліяло на её плод"* (в. Каравацічы) [2].

Згодна з павер'ем, бедны памінальны стол мог абразіць і раззлаваць памерлага, таму яго імкнуліся зрабіць як мага багацейшым. Назва памінальнай трапезы часам паходзіла ад яе галоўных абрадавых страў: гарачкі (гарачы пшанічны хлеб) або клёцак (мучны выраб). У некаторых рэгіёнах слова "клёцкі" атаясамлівалася са смерцю: пра безнадзейна хворага чалавека казалі: "Ну, клёцкі яму…". Існавала традыцыя саджаць за памінальны стол і карміць усіх, хто прыйшоў, нават незнаёмых, асабліва жабракоў.

Пасля трапезы маліліся, дзякавалі гаспадарам, выказвалі спачуванні і разыходзіліся па дамах. Паводле павер'я, першым з жалобнага стала павінен быў уставаць старэйшы па ўзросце, бо лічылася, што той, хто выйдзе раней, першы і памрэ. Гэтае павер'е не тычылася толькі святароў.

Памінкі праводзіліся ў доме памерлага адразу пасля пахавання, а таксама ў наступныя дні пасля смерці: на трэці (траціны), дзевяты (дзевяціны), саракавы (сарачыны), праз паўгода і праз год. На гадавіну смерці адзначаліся прыкладзіны, калі на магілу клалі кавалак дрэва (абруб, прыклады) або камень і ставілі крыж. На магіле наладжвалася абрадавая трапеза, частку ежы з якой пакідалі для нябожчыка. Памінкі на гадавіну завяршалі першы цыкл памінання памерлага. Далей нябожчыка паміналі на Дзяды – у спецыяльныя памінальныя дні, прадугледжаныя народным календаром.

Такім чынам, пахавальная абраднасць Рэчыцкага раёна – гэта не проста рытуал развітання, але і скаладаная і глыбокая сістэмы, накіраваная на падтрыманне гармоніі паміж светам жывых і памерлых, дзе кожнае дзеянне, слова, прадмет маюць сімвалічнае значэнне і адлюстроўваюць спрадвечныя ўяўленні пра неўміручасць душы і цыклічнасць жыцця.

## Спіс літаратуры


1 Фальклорна-этнаграфічная і літаратурная спадчына Рэчыцкага раёна / укладанне, сістэматызацыя, тэксталагічная праца, уступныя арты-кулы, рэдагаванне І. Ф. Штэйнера, В. С. Новак. – Мінск : ЛМФ «Нёман», 2002. – 384 с.

2 Матэрыялы навукова-вучэбнай фальклорнай лабараторыі пры кафедры рускай і сусветнай літаратуры УА «Гомельскі дзяржаўны ўні-версітэт імя Францыска Скарыны».